# Я ХАДЖУ, ЗАКАХАНЫ ...

СЛОВЫ Н. ГІЛЕВІЧА

МУЗЫКА І. ЛУЧАНКА
АРАНЖЫРОЎКА С. БЕЛЬЦЮКОВА

Ноты с сайта www.notarhiv.ru






*Варыянт для II куплета



3.Я ха_
Em6 Am
Am simile
Em6 Dm6 E7
край дара_ гі!" Толь_кі з род_ на_ га до_ лу, толькі ў роднай ду_ бро_ ве — як не
E7 Dm7 G7 C7+ Em7 A7
дрэ_ вам, хоць кветкай прарас_ ту для жы_ вых. А...
Dm B♭7 5- Am E7 Am




Я хаджу, закаханы у твае краявіды,
І шапчу, як прызнанне: "О, мой край дарагі!"
Зноў нясу табе ў споведзь і трывогі, і крыўды,
І надзеі, і ўцехі, і любоў, і грахі.

Пасля доўгіх расстанняў і далёкіх вандровак
Я навекі вярнуся ў засень клёнаў тваіх.
Толькі з роднага долу, толькі ў роднай дуброве –
Як не дрэвам, хоць кветкай прарасту для жывых.

Я хаджу, закаханы у твае краявіды,
І шапчу, як прызнанне: "О, мой край дарагі!"
Толькі з роднага долу, толькі ў роднай дуброве –
Як не дрэвам, хоць кветкай прарасту для жывых.